# ПОЛАЦК У ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ ЕЎРОПЫ

*Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Полацк, 22–23 мая 2012 г.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
«Беларуская навука»
2012

УДК [903/904+94](476.5-21Полацк)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
П49

Рэдакцыйная калегія:

А. А. Каваленя, доктар гістарычных навук, прафесар;
Д. М. Лазоўскі, доктар тэхнічных навук, прафесар;
В. В. Даніловіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар;
Д. У. Дук, доктар гістарычных навук, дацент

Навуковы рэдактар, укладальнік

доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук, прафесар Ю. М. Бохан
доктар гістарычных навук, дацэнт С. А. Піваварчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2007 г. № 647 «Аб зацвярджэнні Комплекснай праграмы развіцця г. Полацка на 2008–2012 гады», у адпаведнасці з п. 23 «Арганізацыя працы пастаяннай археалагічнай экспедыцыі па вывучэнні Полацкай зямлі» (кіраўнік экспедыцыі – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко); у рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» («Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава») (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя): падпраграма № 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа («Гісторыя і культура») (навуковы кіраўнік падпраграмы – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч); у рамках правядзення Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Полацк у гісторыі і культуры Еўропы» (Полацк, 22–23 мая 2012 г.).*

**ISBN 978-985-08-1496-8**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2012
© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2012
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2012

***Прывітальнае слова*** ўдзельнікам Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Полацк у гісторыі і культуры Еўропы» акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара

*Аляксандра Аляксандравіча Кавалені*

Паважаныя гаспадары і ўдзельнікі навуковага форуму!

Перш за ўсё прыміце самыя сардэчныя прывітанні ад імя кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з нагоды пачатку працы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Полацк у гісторыі і культуры Еўропы», прысвечанай знамянальнай юбілейнай даце ў гісторыі нашай краіны – 1150-годдзю старажытнейшага беларускага горада Полацка – калыскі беларускай дзяржаўнасці, аднаго з дзяржаваўтваральных цэнтраў усходніх славян, у якім знаходзяцца вытокі беларускай нацыі.

Гістарычны працэс фарміравання беларускага этнасу і яго дзяржаўнасці надзвычай складаны і супярэчлівы. Беларускія землі, знаходзячыся на важным геапалітычным скрыжаванні Еўропы, неаднаразова станавіліся арэнай кравапралітнага супрацьстаяння. Часам нават біялагічнае існаванне беларускага народа ставілася пад пагрозу. За час доўгага гістарычнага развіцця паступова трансфармаваліся сацыяльна-эканамічныя адносіны, выкрышталізоўваліся нацыянальныя асаблівасці і рысы беларусаў, фарміраваліся іх духоўныя і культурныя каштоўнасці, якія з'явіліся найважнейшымі перадумовамі стварэння дзяржаўнасці.

Сённяшні навуковы форум арганізаваны супольнымі намаганнямі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацкага гарадскога выканаўчага камітэта і Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Такое творчае ўзаемадзеянне з'яўляецца вельмі важным і неабходным у сучасных умовах, калі патрабуецца спалучэнне фундаментальных навуковых гістарычных даследаванняў з папулярызацыяй і пашырэннем ведаў па айчыннай гісторыі.

Правядзенне падобных мерапрыемстваў – гэта непасрэдная практычная ідэалагічная работа, якая накіравана на кансалідацыю беларускай нацыі, забеспячэнне гарманізацыі грамадскіх адносін, выхаванне патрыятызму, грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці і нацыянальнага гонару. Гэта вельмі важна для далейшага паспяховага развіцця нашай краіны, умацавання духоўна-маральных і ідэалагічных асноў беларускага грамадства.

Рэспубліка Беларусь – незалежная дзяржава з уласнай багатай гісторыяй, створанай шматлікімі пакаленнямі людзей, якія жылі на нашай зямлі. Выву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чэнне, захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, яго багатай і слаўнай гісторыі – справа высакародная, адказная і запатрабаваная жыццём.

Няма неабходнасці ідэалізаваць мінулае, аднак нельга забываць спадчыну папярэдніх пакаленняў. Славай сваіх продкаў не толькі можна, але і трэба ганарыцца. Жыватворная нітка сувязі паміж пакаленнямі нашага народа не павінна перарывацца. Гэта задача мае не толькі культурна-асветніцкае, але і палітычнае значэнне, бо народ, які не ведае сваёй гісторыі, не мае будучыні, а без народа не можа быць і дзяржавы.

Гісторыю Полацка стваралі выдатныя асобы – гонар усёй нашай краіны: святая заступніца зямлі беларускай Еўфрасіння Полацкая, усходнеславянскі першадрукар Францыск Скарына, асветнік і публіцыст Сімяон Полацкі, ювелір Лазар Богша, дойлід Іаан, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі, беларускія мастакі Валенцій Ваньковіч і Іван Хруцкі, заснавальнік беларускага кіно Юрый Тарыч і многія-многія іншыя вядомыя ўсяму свету людзі, якія з'яўляюцца прыкладам адданасці Радзіме і служэння свайму народу.

Гістарычнае мінулае Полацка насычана як перамогамі і дасягненнямі, так і шматлікімі выпрабаваннямі. Яшчэ ў пачатку XIII стагоддзя палачане не аднаразова выступалі супраць крыжакоў, абараняючы свае землі і дапамагаючы суседнім народам і плямёнам. У бітве наўгародцаў са шведамі на Няве ў 1240 годзе вайсковай адвагай вызначыўся Якаў Палачанін. У 1380 годзе князь Андрэй Полацкі з дружынай разам з войскамі Дзмітрыя Данскога здабыў перамогу над мангола-татарамі на Куліковым полі. Падчас Айчыннай вайны 1812 года Полацк быў месцам кравапралітных баёў расійскіх войскаў з часткамі напалеонаўскай арміі. У памяць аб гэтым адзін з гарадскіх мастоў праз раку Палату носіць назву «Чырвоны». Гераізм і мужнасць праявілі палачане ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Подзвігі сямнаццаці з іх адзначаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза. Навечна застануцца ў народнай памяці гераічныя ўчынкі Таццяны Марыненка, Зінаіды Тусналобавай-Марчанка, Аляксандра Гараўца і інш. У 2009 г. указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі Полацк узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Нягледзячы на велізарныя цяжкасці, кожны раз пасля ліхалеццяў горад ажываў і адраджаўся, здзіўляючы непаўторнай, велічнай прыгажосцю. Сучасны Полацк – буйны прамысловы, транспартны, гандлёвы і культурны цэнтр Беларусі. Высокі ўзровень эканамічна-культурнага развіцця горада – гэта несумненная заслуга працавітых жыхароў Полацка, яго інтэлігенцыі, вучоных і гарадскога кіраўніцтва, якія займаюцца карпатлівай штодзённай працай, упэўнена і спакойна пацвярджаюць сваю любоў да роднага горада, падтрымліваюць прывабны вобраз Полацка ў вачах беларускіх і замежных грамадзян.

Я ўпэўнены, што агульнымі намаганнямі навукоўцаў, дзяржавы, мясцовых улад, грамадства, прадстаўнікоў духавенства, работнікаў культуры, на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаўнікаў, краязнаўцаў і ўсіх, каму неабыякавы лёс беларускай мінуўшчыны, мы здольны вырашаць многае ў захаванні і адраджэнні нашай гісторыка-культурнай спадчыны, забяспечваць глыбінную гістарычную сувязь маладых пакаленняў грамадзян Рэспублікі Беларусь з нацыянальнымі духоўнымі вытокамі і каранямі, фундаментальнымі каштоўнасцямі беларускага народа.

Сённяшняя канферэнцыя – выдатны прыклад захавання гістарычнай памяці аб векапомных падзеях нашага мінулага. Я ўпэўнены, што праца навуковага форуму будзе плённай і карыснай як для гістарычнай навукі, так і для справы папулярызацыі велічнай гісторыка-культурнай спадчыны Полацка, умацавання пачуццяў гонару і любові да нашай роднай Беларусі.

Жадаю ўсім удзельнікам канферэнцыі здароўя, дабрабыту і багатага творчага плёну!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ